# «НІКОЛІ НЕ ГЛЯНУЛА Б НА МУЖЧЫНУ-ЛАЙДАКА»



(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар. «СГ».)

***— Чым лягчэй кіраваць: тралейбусам або аўтобусам?***

— Аўтобусам. За рулём тралейбуса ты сочыш за двума дарогамі — за той, па якой едзеш, і за той, якая над табой — кантактнай сеткай. Але, напрыклад, вучыцца на кіроўцу аўтобуса цяжэй, вышэй патрабаванні — абавязковы вопыт ваджэння. А для тралейбуса дастаткова вытрымаць узроставы цэнз — не менш за 21 год і прайсці медкамісію.

***— А з мужам вы пазнаёміліся, калі працавалі?***

— Мы з ім разам працавалі ў тралейбусным парку. У нас у парку была традыцыя: пасля змены падвозіць дадому калег. Мы з Паўлам жылі ў адным раёне, таму ён вёз мяне дамоў на сваім аўтамабілі. Мы па-сяброўску размаўлялі. Ён ведаў, што ў мяне ёсць жаніх і я планую вяселле.

***— Цікавы паварот...***

— Аднойчы ён пытаецца: калі вяселле? А я кажу: вяселля не будзе. Паша далей: а ты спяшаешся дадому? Я не спяшалася, і мы пасля другой змены паехалі катацца па начным горадзе. Шмат размаўлялі, я шчыра сказала, чаму рассталася з былым хлопцам. Ужо пад раніцу заехалі ў кругласутачны супермаркет — мне нешта трэба было купіць па драбязе. Выходжу з крамы — Павел чакае мяне з букетам кветак у руках. Яшчэ ён купіў феерверкі, і мы іх запускалі за горадам.

**Не разумею жанчын, якія дазваляюць мужчынам сядзець у іх на шыі. Для мяне такі — проста нуль.**

***— Шыкоўна адзначылі расстанне з былым жаніхом. Можаце расказаць, чаму вашы шляхі разышліся?***

— У той час я ўжо працавала ў тралейбусным парку, і ён закаціў сцэну рэўнасці, патрабаваў сысці з працы, маўляў, у калектыве шмат мужчын. Нават спрабаваў падняць на мяне руку. Ні хвіліны не разважала. Адразу сказала, што мы расстаёмся. Ён праз пару дзён патэлефанаваў як ні ў чым не бывала, думаў, што я несур'ёзна сказала аб расстанні.

***— Рэўнасць, магчымае рукапрыкладства... На якіх мужчын вы ніколі не глянулі б?***

— На лайдакоў. Калі не падабаецца работа, значыць, шукай новую. Не разумею жанчын, якія дазваляюць мужчынам сядзець у іх на шыі. Для мяне такі — проста нуль. Ну і яшчэ не стала б уступаць у адносіны з мужчынам, які мае залежнасці, — хоць ад казіно, хоць ад алкаголю.

***— Значыць, раман з Паўлам развіваўся імкліва. А гавораць, што паміж няўдалымі і новымі адносінамі патрэбен перапынак.***

— На маю думку, перапынак патрэбен, калі чалавеку цяжка адпусціць старыя адносіны. Я ж як вострым нажом адрэзала. У мяне не было такіх думак: вось цяпер на злосць табе выйду замуж. Так што я пражыла гэты перыяд нетыпова. Мне пашанцавала, што Павел вельмі тактоўны чалавек.

***— Колькі часу прайшло ад начной паездкі па горадзе да вяселля?***

— Амаль год. Вяселле мы планавалі на раннюю восень, уяўляла, як гэта будзе прыгожа. Прадумвалі афармленне залы, сцэнарый. Але




раптам высветлілася, што я зацяжарыла. І мы паскорыліся. Хоць, прызнаюся, першая цяжарнасць праходзіла так цяжка, што я сказала: мы проста распішамся. Але бацькі настаялі на вяселлі, хоць бы невялікім. Гэта быў першы тэст на гатоўнасць да сямейнага жыцця: умець дамаўляцца, знаходзіць кампраміс.

***— Вы абмяркоўвалі з мужам, колькі ў вас будзе дзяцей?***

— Так, вырашылі, што двое. Я яшчэ настойвала на тым, каб у іх была невялікая розніца ва ўзросце і паспець нарадзіць да 30 гадоў. У мяне з сястрой розніца ў 10 гадоў, і мне даводзілася быць нянькай. А я хачу, каб у маіх дзяцей было дзяцінства. Гляджу навокал і бачу, што маладым бацькам лёгка спраўляцца з маленькімі дзецьмі. Чым старэйшыя, тым цяжэй. А маё жаданне, каб мацярынства было ў радасць. Праўда, я марыла, каб у нас былі сын і дачка, а атрымаліся цудоўныя хлопчыкі, якіх мы вельмі любім. Вой, калі б дакладна ведаць, што атрымаецца дзяўчынка, то я і на трэцяе дзіця згодна. І Павел таксама. Ён такі класны тата! Калі Максім, гэта наш старэйшы сын, толькі нарадзіўся, першы тыдзень я баялася яго купаць. А Павел выдатна спраўляўся. І цяпер бачу, што тата — аўтарытэт для сыноў і іх найлепшы сябар.

Ведаеце, мы дзеля дзяцей і вырашылі перавучвацца на кіроўцаў аўтобуса. Менавіта ў аўтобусным парку пайшлі нам насустрач як маладой сям'і: у нас супадаюць выхадныя, а змены розныя, таму мы нават без садка абыходзімся, самі паспяваем гадаваць сыноў. Вядома, пры неабходнасці нам дапамагаюць нашы мамы.

***— А як іншыя абавязкі ў сям'і размеркаваны?***

— Мы неяк нічога асабліва і не дзялілі. Павел вельмі смачна гатуе, да таго ж для яго гэта яшчэ і эстэтычны момант: ён абавязкова прыдумае ўпрыгожанне для стравы. У нас побыт неяк так наладжаны, што мы на ім асабліва і не завастраем увагі.

***— У вас з мужам падобныя характары?***

— Не, што вы! Я ўся такая шумная, актыўная, а муж — мысляр. Здзіўляюся, як ён мяне церпіць! Але пры ўсёй гэтай адрознасці нам заўсёды ёсць пра што пагаварыць і вельмі цікава разам.

***— Ці задаволеныя вы заробкам?***

— Зарплата годная, хоць чалавек так уладкаваны, што заўсёды хочацца больш. Але мы ўмеем жыць на тыя грошы, якія зарабляем. Шчыра кажучы, мне падабаецца, што ў нас аднолькавы фінансавы ўнёсак у сямейную касу. Мусіць, як у шматлікіх сем'ях, мы абмяркоўваем і плануем буйныя пакупкі. А так — у каго ёсць час, той і купіў прадукты, аплаціў рахункі.

***— На чым ніколі не будзеце эканоміць?***

— На здароўі, на развіцці дзяцей. Мы купляем якасныя прадукты. Што датычыцца адзення, то рабочая форма дазваляе крыху эканоміць. А яшчэ ў мяне ёсць хобі — шыццё і вязанне. Галоўнае, што сям'і падабаецца мая прыкладная творчасць. На работу мы ездзім не на дзяжурным аўтобусе, а на сваім аўто — гэта магчымасць лепш адпачыць, сэканоміць час на дарогу, але пры тым патрацціца на бензін. Камфорт бясплатным не бывае.

***— Вы жывяце з бацькамі ці асобна? І ўвогуле, як складваюцца адносіны са старэйшым пакаленнем?***

— Мы пабудавалі аднапакаёвую кватэру і хацелі абмяняць яе з даплатай на трохпакаёвую, але нашых назапашванняў не хапіла. Тады свякроў сказала, што яны з мужам пераязджаюць у нашу кватэру, а мы жывём у кватэры Пашавых бацькоў. Гэта вельмі вялікая падтрымка для нас, за якую мы ўдзячныя. А яшчэ мы любім бываць на лецішчах нашых бацькоў. Стараемся дапамагаць, нешта вырасціць, каб паназіраць за працэсам. Нашы бацькі паміж сабой маюць добрыя стасункі, і мы рады, што дзеці растуць у атмасферы вялікай дружнай сям'і.



Максім і Іван.




***— У аўтобусным парку ўсё ж у асноўным працуюць мужчыны. Ці адчуваеце вы павышаную ўвагу? Ну ці, напрыклад, вам дапамагаюць у сітуацыях, у якіх мужчыны самі спраўляюцца?***

— Звычайнае стаўленне, як да калегі. Павышаная ўвага — не, таму што ўсе ведаюць: я замужам. Лічу, што на рабоце пазіцыя «я дзяўчынка ў ружовай сукеначцы» проста недарэчная. Усё, што я павінна ведаць і ўмець, я ведаю і раблю.

***— Вы сказалі, што ў парку вам пайшлі насустрач як маладой сям'і. А як у цэлым у вашым калектыве клапоцяцца аб работніках?***

— Перш за ўсё, я адзначыла б паважлівае стаўленне начальства да работнікаў. У нас моцная прафсаюзная арганізацыя, якая дакладна сочыць, каб выконваліся ўсе абавязацельствы наймальніка. Таксама шмат робіцца для згуртавання калектыву: гэта і паходы ў тэатр, і экскурсіі.

***— Скажыце шчыра, кіроўца аўтобуса — гэта цяжкая прафесія для жанчыны?***

— Нялёгкая, але мяне яна задавальняе. А вось Павел столькі разоў казаў пра тое, што мне трэба шукаць работу лягчэй... Паразважала над яго словамі і паступіла ў БНТУ на спецыяльнасць «Эксплуатацыя транспартных сродкаў». Так што, атрымаўшы дыплом, змагу перайсці на офісную работу.

***— Але пакуль вы на яе не перайшлі, можа, ёсць мара як у кіроўцы? Напрыклад, папрацаваць на міжгародніх ці міжнародных рэйсах?***

— Можа, гэта дрэнна, але няма ў мяне такой мары. І вось чаму: люблю Мінск. Вось веду напамяць свае маршруты, але кожны раз любуюся горадам. І яшчэ для мяне важна як мага больш часу бавіць з сям'ёй. Не хачу адна далёка з'язджаць.

***— А вашы хлопчыкі выпадкова не рыхтуюць ужо сябе да прафесіі кіроўцы?***

— Старэйшы сын нас здзіўляе. Максіма ніхто не вучыў, ён сам пачаў рабіць мадэлі машын, аўтобусаў. Іван пакуль маленькі, але ўпэўнена, што хутка і ён сябе пакажа. Рана яшчэ думаць, якія яны выберуць прафесіі, але мы павінны даць ім магчымасць мець як можна больш ведаў.

***— Вы неяк абмяжоўваеце час, які дазваляеце праводзіць дзецям з гаджэтамі?***

— Ва ўсякім разе імкнёмся рэгуляваць, дамаўляцца. І думаю, атрымліваецца: улетку нашы дзеці могуць увесь дзень правесці на свежым паветры, удзельнічаць у розных гульнях і проста забыцца пра смартфон. Сваю ролю іграе і стаўленне бацькоў да тэхнікі. Вядома, мы карыстаемся, але без фанатызму. Вось вы мяне ў пачатку сустрэчы збянтэжылі пытаннем пра фатаграфіі... Калі ўсё добра, калі жыццё цікавае, то проста атрымліваеш асалоду ад моманту, а не фатаграфуеш, каб тут жа ў сацсеткі выкласці.

***— Як вы любіце праводзіць вольны час?***

— Мы заўсёды за актыўны адпачынак! Селі на веласіпеды і паехалі! Любім ездзіць па Беларусі: прырода, замкі, старыя сядзібы — столькі прыгажосці! А яшчэ мы з задавальненнем карыстаемся магчымасцю адпачынку ў нашым ведамасным санаторыі. Для работнікаў «Мінсктранса» кошт пуцёўкі складае ўсяго толькі 10 працэнтаў. Мы едзем з дзецьмі, мацуем здароўе і весела адпачываем.

**Маргарыта ДРАЗДОВА.**
**Фота з сямейнага архіва Вікторыі ШУМЕЛЬЧЫК.**